# Усім законам закон

## Трыццаць гадоў таму была прынята Канстытуцыя – першая ў гісторыі суверэннай Беларусі

У адзіны дзень галасавання зранку сустрэў ля пад'езда суседскую дачку Лізу. Дзяўчыне восенню споўнілася васямнаццаць, сёлетнія выбары для яе першыя і суседзі планавалі з такой нагоды адправіцца галасаваць усёй сям'ёй. Ведаючы пра гэта, пацікавіўся ў Лізы, ці хадзілі ўжо на выбарчы ўчастак.

– Так, прагаласавалі. Тата з мамай сустрэлі знаёмых, а я бягу дадому, – заўсміхалася дзяўчына. – Вось падарылі…

Ліза працягнула мне ладную, у цвёрдым пераплёце цёмна-вішнёвага колеру кніжачку. Прызнацца, абноўлены паводле рашэння Рэспубліканскага рэферэндума ў лютым 2022 года Асноўны Закон у выглядзе асобнага выдання дагэтуль не бачыў. З задавальненнем пагартаў старонкі, што яшчэ пахлі друкарскай фарбай. Якая неверагодная, фантастычная моц у гэтага дакумента, паводле якога жыве, заняўшы «пачэсны пасад між народамі», наша суверэнная краіна і ладзіць мірнае, стваральнае жыццё беларускі народ!

У найноўшай гісторыі Беларусі нямала важных і ключавых дат. Адной з іх невыпадкова з'яўляецца 15 сакавіка 1994 года. У гэты дзень Вярхоўны Савет прыняў Канстытуцыю, якая заклала трывалы прававы фундамент незалежнасці. Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года, у савецкі перыяд на тэрыторыі Беларусі дзейнічалі чатыры Канстытуцыі, іх прымалі ў 1919, 1927, 1937 і 1978 гадах. Але Асноўны Закон 1994-га, несумненна, выбіваецца з раду: гэта першая Канстытуцыя менавіта суверэннай беларускай дзяржавы. Можна сказаць, новы Асноўны Закон упершыню ў нашай гісторыі стаў тым самым нязломным фундаментам, на якім увасобілася спрадвечнае імкненне беларусаў быць паўнапраўнымі гаспадарамі на роднай зямлі. Што прынцыпова важна, у сістэме вышэйшых органаў дзяржаўнай улады прадугледжвалася пасада Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Паводле артыкула 95 Канстытуцыі 1994 года, Прэзідэнт з'яўляўся кіраўніком дзяржавы і выканаўчай улады.

**Усебеларуская акцыя «Мы – грамадзяне Беларусі», прысвечаная Дню Канстытуцыі, сімвалічна стартавала ў Канстытуцыйным Судзе. Юным беларусам іх першыя пашпарты ўручылі старшыня Канстытуцыйнага Суда Пётр Міклашэвіч і першы сакратар ЦК БРСМ Аляксандр Лук'янаў**





За трыццаць год у выніку рэспубліканскіх рэферэндумаў у Асноўны Закон чатыры разы ўносілі змяненні і дапаўненні. Грамадства чуйна рэагавала на тыя часовыя выклікі, што сустракаліся ў гісторыі нашай краіны, і, адпаведна, як жывы арганізм мянялася Канстытуцыя. Асноўны Закон, акрэсліваючы штораз перспектывы далейшага ўладкавання і развіцця краіны, з'яўляецца неацэнным і эфектыўным фактарам сацыяльнай мабілізацыі, задае вектар будучыні. Пра гэта вельмі добра сказаў Прэзідэнт у Пасланні да беларускага народа і Нацыянальнага сходу 28 студзеня 2022 года, якраз за месяц да Рэспубліканскага рэферэндума, на які выносілася пытанне аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь: «Дзеючы Асноўны Закон, па сутнасці, выканаў сваю гістарычную місію. У свой час мы не толькі адвялі народ ад прорвы – першая мая праграма, больш я нічога не абяцаў. Тады, у сярэдзіне 1990-х гадоў, народ трэба было адвесці ад прорвы. Мы не толькі адвялі, але і сфарміравалі сваю ўласную дзяржаву. Цяпер час ісці далей», – канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Без перабольшвання, над абноўленай Канстытуцыяй, паводле якой жыве сёння наша краіна, працавалі ўсім грамадствам. На працягу года дзейнічала прадстаўнічая Канстытуцыйная камісія. Больш як месяц на дыялогавых пляцоўках ішлі дыскусіі і абмеркаванні, паступіла амаль дзевяць тысяч (!) вартых увагі думак і прапаноў. Дзе, у якой краіне магчыма такое?!

Грунтоўная і шчырая зацікаўленасць беларусаў у новым варыянце Асноўнага Закона пераканаўча паказала, што ў сучасным грамадстве ёсць запыт на абнаўленне і развіццё, на моцную сацыяльную дзяржаву, на захаванне сацыяльных гарантый, на самарэалізацыю, удзел грамадзян у абмеркаванні і прыняцці важных для іх рашэнняў. Гэту выснову канчаткова пацвердзілі вынікі лютаўскага 2022 года плебісцыту: абсалютная большасць выказалася за тое, каб унесці прапанаваныя змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю. Сімвалічна, што рашэнне аб рэферэндуме Прэзідэнт падпісаў 15 сакавіка, у Дзень Канстытуцыі. «Народ праявіў мудрасць і нацыянальную сталасць», – адзначыў кіраўнік дзяржавы падчас урачыстай цырымоніі. Новая Канстытуцыя заклікана аберагаць наша суверэннае права жыць і развівацца як нацыя на сваёй гістарычнай зямлі, падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле народнага рашэння, новым суб'ектам палітыкі стаў Усебеларускі народны сход, ён набыў канстытуцыйны статус. Сёння гэта найвышэйшы прадстаўнічы орган у краіне, які сумясціў у сабе традыцыі найлепшых практык беларускага народаўладдзя. Ён вызначае стратэгію развіцця грамадства і дзяржавы. На наша «народнае веча» дэлегіруюць 1200 чалавек. Дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу з'яўляюцца Прэзідэнт, прадстаўнікі заканадаўчай, выканаўчай і судовай улады, а таксама мясцовых Саветаў і грамадзянскай супольнасці. Да 31 сакавіка апошнія павінны вылучыць кандыдатаў у дэлегаты сходу, а з 1 па 10 красавіка абраць сваіх прадстаўнікоў у найвышэйшы прадстаўнічы орган.

У абноўленай Канстытуцыі замацаваны таксама нормы, што датычаць абароны нашых традыцыйных каштоўнасцей, крыніцай якіх з'яўляецца гістарычная памяць і патрыятызм. Праява патрыятызму, захаванне гістарычнай памяці аб гераічным мінулым беларускага народа сёння з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Асаблівая ўвага нададзена выхаванню традыцыйных сямейных каштоўнасцей, падтрымцы сем'яў з дзецьмі, дзяцей-сірот і дзяцей, што засталіся без апекі бацькоў, а таксама моладзі, клопату дзяржавы аб пажылых людзях і інвалідах.

…Схамянуўшыся, вяртаю Лізе кніжку, на якой золатам выціснута «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь». Нашаму Асноўнаму Закону ўжо 30, але хутчэй за ўсё дзяўчына не задумваецца, чым адметна гэта дата і што яна значыць. Як і пра тое, што маладое пакаленне шчасліва жыве ў дзяржаве, якая развіваецца на канстытуцыйнай аснове, дзе нават у самыя складаныя перыяды правы і свабоды чалавека з'яўляюцца найвышэйшай каштоўнасцю. Дзе створаны неабходныя ўмовы для духоўнага, інтэлектуальнага і фізічнага развіцця, для рэалізацыі самых смелых жыццёвых планаў.

Што ж, моладзі ўласціва ўспрымаць як належнае здабытае папярэднікамі. Але чамусьці веру і нават упэўнены, што менавіта гэты падарунак на сваё паўналецце яна зберажэ на ўсё жыццё.

***Ігар ГАНЧАРУК***